"Ну і што ж тут такога? — заўважыць нехта. — Неразумныя жывёліны, таму і задумалі дурное". Але не спяшайцеся з высновай, сябры. Гэты сюжэт прыйшоў мне ў галаву, калі аднойчы паглядзеў фрагмент з вячэрняй "Панарамы". Прозвішча прамоўцы, на жаль, не запамятаў. Здаецца, гэта быў нехта з так званага Нацыянальнага сходу, з нейкай ініцыятыўнай групы па ўзмацненні саюза Беларусі і Расіі. Паслухалі б вы, якім салаўём ён заліваўся, калі гаварыў пра адзінае грамадзянства, сімволіку, адзіны парламент! Вочы яго блішчэлі. Напэўна, ужо ўяўляў сябе на пасяджэнні таго агульнага парламента ў Маскве і, вядома ж, у новай пяціпакаёвай кватэры... Прамоўца не ўхіляўся і ад цяжкіх пытанняў: "Чаму мы прапануем умацаваць саюз менавіта цяпер, калі ў Расіі развалілася эканоміка?" — ставіць сабе пытанне той рускамоўны салавей і з гонарам спявае ў адказ: "Настоящие друзья познаются в беде!" Не пашкадуем зярнятка!

Ну скажыце, хіба ж не нагадвае вам гэтая мітусня вакол саюза той самы шлюб? Вось і мяркуйце, ці высока ўзняліся думцы і палатнікі над персанажамі драматычнай казкі...

Сяргей ЗАБРАДЗЯНЕЦ, пенсіянер.

г.Баранавічы.

Вострая тэма: працяг размовы

І зараз чую: "Я бы вас всех перестреляла!"

...Мне ўспомніўся красавік 1994 года: я тады падсочыў пару бяроз на палігоне "Уручча", якраз у тым месцы, дзе канчаецца ўзлётная паласа вайсковага аэрадрома. Аднойчы вечарам, гадзін у сем, калі я ішоў за сокам, убачыў каля дзесятка мужчын, якія рыхтаваліся пераначаваць у лесе. На іх была вайсковая адзежа. Праўда, на вайскоўцаў яны не паходзілі, па прычосках ды і па ўзросце сваім былі рознымі. Для начлегу выбралі адну з ямін, якіх тут вельмі многа. Дол засцялілі яловай лапкай, на якую паклалі ці то плашч-палаткі, ці то вопратку, зверху насцілалі нейкую страху з бярвення. Гарэла вогнішча. Двое звалілі ладную елку проста на сцежку. Я ім яшчэ сказаў: "Навошта ссеклі здаровае дрэва? У лесе поўна сухастоін". У адказ нешта буркнулі.

Я пайшоў далей, думаючы, што за людзей сустрэў? Не вайскоўцы. На турыстаў таксама не падобныя. Можа, гэта якое-небудзь беларускае адгалінаванне расійскай "Памяти", пра трэніроўкі якой тады шмат пісалі ў газетах? У рэшце рэшт тая сустрэча забылася...

А ў мінулым годзе мінскі мікраяён "Уручча" быў абвешаны фашыстоўскімі ўлёткамі, дзе было пазначана месца сустрэч, як яны пішуць, "соратников", "сподвижников" и "сторонников". Вось цытата з улёткі: "Только Русские Националисты являются носителями национальной идеи и ставят интересы нации превыше всего! Только Русское Национальное Единство установит Русский Порядок на Русской Земле!".

Што ж гэта за "русский порядок"? Гэта тлумачыцца так: "чтобы ныне распоясавшиеся "меньшие братья" из бывших национальных окраин не чувствовали себя господами на Русской Земле; чтобы русские люди могли спокойно ходить по улицам..." і г.д. "В Русское Национальное Единство может вступить любой Русский человек независимо от возраста и пола..." І ўступаюць. Сёлета мой знаёмы ўжо бачыў некалькі малойчыкаў са свастыкай на адзежы, якія стаялі на прыпынку транспарту. Вось так павольна, але настойліва і ўпэўнена рускі фашызм пранікае ў свядомасць многіх людзей, асабліва маладых. Пранікае ў свядомасць і ператвараецца ў практыку.

...Неўзабаве пасля апублікавання ў "Народнай волі" падборкі пісьмаў у Дзяржкамдрук у Брэсце быў апаганены свастыкай помнік яўрэям — ахвярам гітлераўскага генацыду. Вінаватых, зразумела, не знайшлі. Дарэчы, летам 1994 года свастыкамі апаганьваўся кіёск Таварыства беларускай мовы, які месціўся на праспекце Скарыны каля Нацбанка. Тады праваахоўныя органы на гэта не звярнулі асаблівай увагі. Ва ўсякім разе, выканаўцаў гэтых ганебных актаў так старанна, як выканаўцаў насценных надпісаў "Жыве Беларусь!", і не шукалі. Сёлетняй вясной усчынецца пагром рэдакцый беларускамоўных выданняў "Полымя", "Літаратура і мастацтва", "Беларусь". Вінаватых зноў няма...

Нават прэзідэнцкая газета "Советская Белоруссия" ў нумары за 8 жніўня напісала пра рускіх фашыстаў, якія дзейнічаюць у Беларусі. Што ж да аўтараў лістоў у Дзяржкамдрук, то, на жаль, яны не хочуць бачыць відавочнага. У свой час на гітлераўскіх малойчыкаў таксама асаблівай увагі не звярталі, думалі, "хлопчыкі сваволяць".

А вось яшчэ нядаўнія ўражанні. Стаю, разам з іншымі, у пікеце ў абарону беларускіх школ ад русіфікацыі, які ладзіла Таварыства беларускай мовы ў завулку Ленінградскім. Падыходзіць старая жанчына, якая нарадзілася задоўга да апошняй вайны, магчыма, бачыла яе жахі. Яна раз'юшана крычыць: "Если бы у меня был автомат, я бы вас всех перестреляла!". За што? Толькі за тое, што мы хочам, каб наша радзіма была незалежнай, а дзеці вучыліся па-беларуску? Пажылы мужчына паўтарае сумна знаёмыя словы: "В мире есть только два нормальных языка — русский и английский!". Па прыступках, што вядуць з завулка Ленінградскага на плошчу Незалежнасці падымаецца малады чалавек, які выгуквае: "Белорусов нет! Да здравствует Русское Национальное Единство! Хайль!". Здаецца, штосьці іх усіх яднае...

Валерый ПАЛСЦЮК.

Мінск.

Рэха

Усе мовы добрыя, а свая — найдаражэйшая

Дарэмна І.Васілеўскі, не будучы мовазнаўцам, робіць экскурс у лексікалогію, супастаўляе некалькі рускіх слоў з адпаведнымі беларускімі і прыходзіць да высновы, што яны амаль аднолькавыя, толькі вымаўляюцца беларусамі "гораздо хуже, чем на русском языке". Працягваючы у гэтым плане параўнанні (напрыклад, рускага слова *белый*) з польскім *бялы*, украінкім *білий*, чэшскім *білы*, балгарскім *бял*, І.Васілеўскі мог бы зрабіць тую ж самую выснову: маўляў, палякі, украінцы, чэхі, балгары "сказілі" рускае (першароднае!) слова, каб пасля заяўляць, што і ў іх ёсць нейкая свая мова.

Справа тут не такая простая, як думаецца нашаму паважанаму аўтару. У кожнай з дванаццаці славянскіх моў ёсць каля дзвюх тысяч агульнаславянскіх слоў, блізкіх па гучанні (*вада, рука, брат* і інш.). Ёсць у гэтых мовах і тысячы агульных слоў, запазычаных з іншых, неславянскіх моў (*характар, спорт, аперацыя* і г.д.). Разам з тым кожная мае мноства слоў, характэрных толькі для яе. Яны складаюць нацыянальную спецыфіку пэўнай мовы, звычайна ў іншых мовах іх няма. Напрыклад, амаль усе словы з наступных радкоў Я.Купалы — уласна беларускія: "Час склікаці ўжо грамаду на вялікую нараду, на вялікі сход".

І.Васілеўскі, як ён сам піша, нарадзіўся і вырас у Беларусі. І разам з тым лічыць, што беларуская мова на фоне рускай "выглядит убого и примитивно". Цяжка нават уявіць, каб гэтак абразліва і пагардліва гаварыў пра сваю родную мову чэх ці эстонец, грузін або француз.

Але гэта можна вытлумачыць і незайздросным лёсам нашай нацыі. Аж тры стагоддзі нас то варылі ў катле паланізацыі, то смажылі на патэльні русіфікацыі. Беларуская мова перажыла, кажучы словамі паэта, "панскія здзекі, чэкісцкія чысткі, рогат імперскі, вырак фашысцкі". Усімі сродкамі нам уводзілі ў вушы, што наша мова "хамская, деревенская, мужыцкая" супрацьпастаўляючы яе рускай — сапраўды багатай, але не адзінай такой у свеце. Кожная мова сярод мноства іншых — і адметная, і прыгожая, і найдаражэйшая яе носьбітам. Нельга цалкам не пагадзіцца з Францішкам Багушэвічам, які пісаў, што беларуская мова такая ж "людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо іншая якая".

А ці ёсць на свеце "вялікія" мовы і што ўкладваецца ў гэтае паняцце? Калі пад ім разумець пашыранасць, то самая вялікая ў гэтым сэнсе — кітайская мова, бо на ёй размаўляюць 880 мільёнаў чалавек: затым ідуць англійская (450 млн.), іспанская (226 млн.), хіндзі (182 млн.), руская (160 млн.). Усе сучасныя развітыя літаратурныя мовы свету, і беларуская ў тым ліку, аднолькава роўныя, і няма абсалютна ніякіх падстаў вышукаць сярод гэтых роўных "раўнейшую".

Існуе мова як асноўная адзнака нацыі — жыве і народ. Калі ж знікае мова, то знікае і народ, асімілюючыся з іншым народам. Прыгадаем запавет Ф.Багушэвіча: "Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю... а потым зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі".

І.Васілеўскі ўспамінае, як, перасяліўшыся ў Расію, мусіў перайсці на рускую мову, "так как в России на белорусском языке никто не разговаривает, а если бы кто и стал это делать, то его посчитали бы за ненормального человека". На жаль, у Расійскай Федэрацыі і сёння амаль тое ж самае. Хоць гэта і федэрацыя, куды ўваходзяць не толькі рускія, але і башкіры, татары, удмурты, мардоўцы, комі, тувінцы, якуты, тунгусы, калмыкі і дзесяткі іншых народаў, якія спакон вякоў кампактна пражываюць на сваёй зямлі, але дзяржаўная мова ў Расіі адна — руская. У нас жа не федэрацыя, а, як засведчана ў Канстытуцыі, унітарная дзяржава. Сама логіка падказвае, што ў такой дзяржаве павінен захоўвацца прыярытэт карэннай нацыі. Але, насуперак гэтаму, у нас дзве дзяржаўныя мовы — беларуская і руская. Пры гэтым, будзем шчырымі, адна з іх — беларуская — на становішчы падчаркі. І ў нас сёння да таго, хто загаворыць па-беларуску ў аўтобусе або на вуліцы, ставяцца нярэдка непрыхільна, злосна раяць яму размаўляць на "человеческом языке".

Ёсць у І.Васілеўскага і такое выказванне: "А на какой мове мы будем разговаривать, это другим народам, извините, до лампочки". Напрошваецца адна паралель. 5 жніўня гэтага года на сустрэчы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з членамі Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў, як пададзена ў нядаўна апублікаванай стэнаграме, А.Лукашэнка сказаў: "А для сапраўднага генія, таленту — на якой мове пісаць — не мае рашаючага значэння". Адзін з членаў Рады асмеліўся запярэчыць: "Сапраўдны геній — толькі на роднай мове".

Наша мова перажывае сёння надзвычай цяжкі час. Застаецца толькі спадзявацца на лепшую будучыню. А пакуль што прыходзіць на памяць занатаваны ў зборніках беларускіх прыказак і прымавак горкі афарызм: "Б'юць і плакаць не даюць". Або словы С.Ясеніна: "В своей стране я словно иностранец"...

Іван ЛЕПЕШАЎ, прафесар.

Гродна.

Читатель продолжает разговор

Этот странный цветовод-убийца...

Статья Владимира Шкарубы "Смертельный букет" навела меня на грустные размышления. По ее тону можно понять, что автор относится с сочувствием к матери, которая хотела "как подобает" отправить в школу детей, то бишь снабдить их недостающими к торжественному моменту цветами.

Отношусь к случившемуся с сочувствием, поэтому морализировать, а еще хуже — иронизировать по этому поводу отнюдь не собираюсь. Но человеку свойственно происходящее с другими в какой-то степени перенести и "примерить" на себя: а как бы я поступила на его месте?

Не хочется, признаюсь, быть в роли общественного обвинителя или этакого непогрешимого гражданина: "Вот я такой честный — во всем пример для вас".

Как я полагаю, человек, обладающий чувством собственного достоинства, не срежет у соседа цветы ни при каком стечении оправдывающих его обстоятельств: хотелось гостю сделать приятное и т.п.

Как бы шикарно ни выглядели соседские цветы, каждый должен понимать: они — не твои. Чужие. Проще самому их вырастить или купить, в крайнем случае — попросить, и хотя этот вариант не из приятных, многие расценивают его как попрошайничество, но все же предпочтительнее, чем украсть (назовем вещи своими именами).

Можно сожалеть или только сочувствовать, что наше общество давно уже утратило моральные ориентиры. Но может ли быть иначе в государстве и обществе, которые никогда не воспитывали уважения к личности человека и его собственности?

Большевики, пришедшие к власти на гребне своих популистских лозунгов и грабежа, являли собой весьма сомнительных воспитателей, да еще и поступки "сильных мира сего": мне можно, а тебе... извини, подвинься. Впрочем, и сейчас мало что изменилось в отношениях власти и "подданных" — рядовых граждан.

Трагедия, описанная в "Народной воле", произошла потому, что слабая женщина не смогла устоять перед соблазном любым путем добыть дочери букет.

Что тут можно сказать? Увы-увы, можно пуститься в долгие рассуждения о нравственном примере, точнее, антипримере матери, не совсем правильно влиявшей на воспитание дочери, формирование детской души, ориентиров порядочности и доброты. Думаю, что и тот электрик — "страстный цветовод", который подключил электричество, чтобы обезопасить цветник, — очень и очень пожалел о случившемся, так как в результате его изобретения погибла мать троих детей.

Нищета, бедность, заключает автор статьи, привели к трагедии. На самом же деле — это обычное наше состояние: было бы очень удивительно при нашей экономике наблюдать нечто противоположное.

Татьяна СУХОЦКАЯ.
г.Витебск.

Фотафакт



Вось такі баравік вагой у паўтара кілаграма знайшоў у наваколлі Віцебска Мікалай Іванавіч Зарытоўскі. Шляпка грыба-велікана ў акружнасці — цэлых семдзесят сантыметраў!

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БелТА.

История Ивенца уходит в глубь веков

Государственная геральдическая служба зарегистрировала герб городского поселка Ивенец. Он представляет собой щит так называемой варяжской формы. В его красном поле изображена графская корона золотого металла, под ней — элемент родового герба Сологубов — золотой лев.

Как пояснил в беседе с корреспондентом БелТА начальник Государственной геральдической службы, кандидат исторических наук Сергей Рассадин, местечко Ивенец с начала XVI и до конца XIX века принадлежало известному белорусскому роду Сологубов, многие его представители были крупными военачальниками и отличились на полях брани, в том числе — в военной кампании 1812 года.

Что же касается герба, то изображенная там золотая графская корона — знак и память того, что в начале 18 века Ивенец являлся центром одноименного графства. В геральдике золотой цвет символизирует справедливость, милосердие и богатство.

Оксана ОСПИЩЕВА.

Горацкія дэпутаты выказаліся за аб'яднанне горада і раёна

На праведзенай 20 кастрычніка сесіі дэпутаты Горацкага раённага Савета аднагалосна прагаласавалі за аб'яднанне раёна і горада ў адну адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку — Горацкі раён. Раней такое ж рашэнне большасцю галасоў прынялі на сесіі Горацкага гарадскога Савета дэпутатаў.

Нагадаем, што год таму такое аб'яднанне адбылося ў горадзе Крычаве і раёне. Час пацвердзіў правільнасць гэтага выбару. Менш стала цяганіны ў вырашэнні розных праблем, тэрытарыяльных і гаспадарчых спрэчак. А скарачэнне штатаў кіраўніцкага апарату дало магчымасць значна зэканоміць расходы бюджэтных сродкаў.

Мікалай НАЗАРОВІЧ, БелТА.

И в шутку и всерьёз?
Шутите, но не забывайте, что в каждой шутке есть доля правды. ТЕСТ

ЕСТЬ ЛИ У ВАС ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ?

Нам постоянно приходится слышать: "У него есть высшее образование." "У него два высших образования."

Нам постоянно приходится говорить: "У меня есть высшее образование." А так ли это на самом деле?

Итак, приглашаю Вас ответить на следующие вопросы и понять, есть ли у Вас высшее образование (все ответы оцениваются определённым количеством баллов):

1. Видите ли Вы сны, в которых разговариваете на языке своей Родины?
а). Часто - 2 балла.
б). Очень редко - 1 балл.
в). Никогда - 0 баллов.

2. Знаете ли Вы основные вехи тысячелетней истории своей Родины?
а). Да - 2 балла.
б). Не очень - 1 балл.
в). А зачем? Нет - 0 баллов.

3. Владеете ли Вы иностранным языком, который Вам преподавали в высшем учебном заведении?
а). Да - 2 балла.
б). Не очень - 1 балл.
в). Нет - 0 баллов.

4. Желаете и умеете ли Вы учиться и переучиваться с целью самосовершенствования и овладения тонкостями своей профессии?
а). Желаю, умею и занимаюсь постоянно. Считаю, что без этого нет будущего - 3 балла.
б). Желаю через раз - 2 балла.
в). Считаю, что умею, но нет желания - 1 балл.
г). Не желаю да и не умею - 0 баллов.

5. Как Вы оцениваете свои профессиональные навыки?
а). Отлично - 3 балла.
б). Не очень - 2 балла.
в). Плохо - 1 балл.
г). Никак - 0 баллов.

А теперь подсчитайте баллы!

От 11 до 12 баллов. Вы не даром потратили своё время - высшее образование у Вас есть!

От 8 до 10 баллов. Не отчаивайтесь! У Вас ещё не всё потеряно! Немного потрудившись, сможете сказать, что у Вас есть высшее образование.

7 и меньше баллов. Что можно сказать в этом случае...Никогда и никому не говорите, что Вы имеете высшее образование. Его у Вас нет! Вы просто имеете диплом, подтверждающий, что оно у Вас есть, а на самом деле Вы просто прослушали курс лекций по программе высшего учебного заведения и при этом как-то умудрились не завалить экзамены.

Составил ***Сергей Латышев.***

Крымінал

Старшыня "напартызаніў" на дарозе

Амаль пустынныя цяпер дарогі ў глыбінцы, вельмі рэдка сустрэнеш на іх транспартныя сродкі. Але тым не менш днямі каля 8 гадзін раніцы на ўчастку шашы Браслаў — Полацк было знойдзена цела забітага старога. Па ўсіх прыкметах, дзядок загінуў ад удару аўтамашыны, якая знікла з месца здарэння. Праўда, праз некаторы час па падазрэнні ва ўчыненні гэтага наезду міліцыяй быў затрыманы старшыня калгаса "Баявы партызан" М. Следчыя зараз спрабуюць высветліць, у якім стане быў кіраўнік за рулём службовага УАЗа, што адбылося такое непапраўнае здарэнне на дарозе. З пачатку года на Віцебшчыне ў выніку дарожна-транспартных здарэнняў загінула ўжо 92 суайчыннікі. Кожная трэцяя аварыя ўчынена вадзіцелямі ў нецвярозым стане.

Уладзімір ШАЙКОЎ.

Дзікунства

Раскольнікавы нашых дзён

Ва ўсім свеце адносіны да пажылых людзей паважлівыя і добрыя. У нашай жа краіне апошнім часам старэнькія бабулі і дзядулі ўсё часцей становяцца ахвярамі жорсткіх і цынічных нашчадкаў. Не спадабалася чамусьці 39-гадоваму віцябляніну С.Багданаву на лесвічнай клетцы 82-гадовая адзінокая старая. У п'яным угары, не ўсведамляючы, што ён робіць, раней чатыры разы судзімы ўварваўся ў яе кватэру. Без усялякай мэты бандыт нанёс жанчыне 10 смяротных удараў нажом, за што па прыгаворы Віцебскага абласнога суда асуджаны на 18 гадоў пазбаўлення волі. Лічы, за кратамі нелюдзь завершыць сваё нікчэмнае жыццё, бо прызнаны асабліва небяспечным рэцыдывістам са змяшчэннем у калонію асаблівага рэжыму.

Здаецца, нікому не перашкаджала і нікога не баялася ў гарпасёлку Ветрына таксама адзінокая 93-гадовая бабулька, пакуль на яе зямным шляху не сустрэліся родныя браты Балоніны. Гэтыя нідзе не працуючыя мясцовыя цыганы неяк летам адзначылі дзень нараджэння 33-гадовага старэйшага Івана. Хацелася дабавіць, ды грошы ўжо скончыліся. Тады і ўспомнілі бейбусы пра старую, якая не баялася пускаць да сябе незнаёмых людзей. Вечарам яна смела адчыніла хату і Балоніным, якія спачатку папрасілі папіць вады. Пакуль старэйшы размовамі адцягваў увагу гаспадыні, малодшы Раман безвынікова абшукаў кватэру, толькі заўважыў пад халацікам жанчыны цэлафанавы пакецік з грашамі. Каб завалодаць здабычай, цыганы папрасіліся пераначаваць, што ім і дазволіла добрая душа. Неўзабаве ў цемры 23-гадовы брат проста засек старую і завалодаў няшчаснымі 490 тысячамі рублёў.

Судовая калегія абласнога суда на адкрытым выязным пасяджэнні ў Полацку прыгаварыла Р.Балоніна да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу. Напарнік забойцы І.Балонін асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Вярхоўны Суд краіны пакінуў гэтае судовае рашэнне без змянення. За 9 месяцаў, дарэчы, ад рук злачынцаў загінула ў рэгіёне 346 чалавек, колькасць забойстваў да леташняга ўзроўню вырасла на 50 выпадкаў.

Здарэнні

Наступны прыпынак — кювет

На ўсё жыццё запомняць тую вечаровую паездку ў аўтобусе, які курсіруе паміж гарадамі Полацк і Наваполацк, многія пасажыры шчыльна запоўненага "Ікаруса". Напярэдадні выхадных ніхто не чакаў непрыемнасцей, пакуль на сустрэчную паласу нечакана перад аўтобусам не выскачыла "Аўдзі-80". Дарога ў тым месцы паблізу горада нафтахімікаў даволі небяспечная, бо на ёй шмат рэзкіх паваротаў і спускаў. На адным з іх вадзіцель іншамаркі не справіўся з кіраваннем, а ягоны калега, каб прадухіліць лабавое сутыкненне, рэзка павярнуў убок.

Удар, але не такі моцны, усё ж па баку "Аўдзі" адбыўся. Толькі і аўтобус перавярнуўся і зваліўся ў кювет. На шчасце, загінуўшых у гэтай аварыі не аказалася. Найбольш пацярпеў адзін пасажыр аўтобуса, які з рознымі пераломамі змешчаны ў бальніцу. Да ўрачоў за дапамогай прыйшлося звярнуцца яшчэ пяці пасажырам, а таксама незадачліваму кіроўцу іншамаркі. Акрамя лячэння, віноўніка аварыі чакае яшчэ нялёгкае тлумачэнне сваіх дзеянняў у міліцыі.

Уладзімір ШЫК.

Стоп-кадр



Хоць адлятаўся, але без работы не застаўся.

Непридуманные истории

Поздний звонок

Около одиннадцати вечера у меня дома раздался телефонный звонок. Плакал ребенок...

— Мама... Где мама? Я боюсь... Я маленький. Меня нельзя оставлять одного. Найди маму...

Пытаюсь успокоить растерянного малыша и начинаю расспрашивать. Оказывается, зовут мальчика Артем Питко (фамилия изменена), ему недавно исполнилось пять лет. Его мама еще днем куда-то ушла и до сих пор не возвращалась. В поисках мамы малыш начал набирать наугад телефонные номера и таким образом совершенно случайно дозвонился ко мне домой. Маму мальчика зовут Соня, папу — дядя Саша. Мама работает на стройке. Живут они в однокомнатной квартире. Бабушка с дедушкой уехали на дачу. Вот, собственно, и все...

Ни названия своей улицы, ни номера дома, ни номера своего телефона пятилетний малыш не знал. И тем не менее, захлебываясь от плача, умолял меня приехать к нему. Объяснял, что его дом находится недалеко от детского садика, номер которого тоже был ему неизвестен. Разговаривая с ним о простых детских радостях вроде любимой машины и детсадовского друга, я пыталась найти хоть какие-нибудь зацепки, чтобы узнать что-либо, что помогло бы разыскать адрес мальчугана. Но мои попытки оказались тщетными. И потому, вспоминая телепередачу "911", я просто продолжала говорить с Артемом. О чем угодно, лишь бы отвлечь его от мыслей о маме. Наш разговор продолжался около часа. Вдруг малыш радостно крикнул: "Ой, мама пришла!" и положил трубку...

Несмотря на относительно благополучный конец этой истории, у меня осталось много вопросов. Мама просто загуляла в субботний вечер или же действительно с ней что-то произошло? Почему пятилетний ребенок не знает собственного адреса? Что бы могло произойти, если бы мама не пришла ночевать, а малыш случайно бросил трубку?

И что же делать, когда твоя реальная жизнь совершенно случайно соприкасается со страданием ребенка, когда ты слышишь детский плач и практически ничем не можешь помочь?

Анна СОУСЬ.

Хочаце — верце, хочаце — не верце...

Будучы тыдзень: зоркі прадказваюць

Астрапсіхалагічны прагноз на перыяд з 26 кастрычніка па 1 лістапада

Тыдзень, як абяцаюць зоркі, у асноўным будзе спакойным. Для многіх будуць уласцівыя сур'ёзнасць і сканцэнтраванасць. Верагодна, гэта зробіць панядзелак—сераду пасяховымі і прадуктыўнымі для шырокамаштабных дзеянняў у многіх сферах жыцця. Праўда, пачатак тыдня дазволіць яшчэ пэўную раскачку і магчымасць пасумнявацца ды падумаць, але ўжо з сярэдзіны тыдня ад нас запатрабуюцца акуратныя і разам з тым энергічныя дзеянні ў самых розных пачынаннях. Субота і нядзеля будуць дастаткова напружанымі з той нагоды, што ў некаторых можа з'явіцца схільнасць да надта хуткіх рашэнняў і неабмеркаваных дзеянняў. Найбольш напружанымі могуць стаць 28 кастрычніка і 1 лістапада.

АВЕН. Тыдзень пасадзейнічае некаторым зьмяненням у розных сферах жыцця. Пастарайцеся па магчымасці прааналізаваць усе яго бакі, знайсці ўстарэлыя і неадпавядаючыя рэальнасці рысы. Падумайце аб тым, як можна іх змяніць. Усе гэта патрэбна для таго, каб змяненні, якія часта прыходзяць звонку, не пазбавілі вас бадзёрасці душы і цела, бо папярэджаны — значыць узброены.

ЦЯЛЕЦ. Вам прыйдзецца добра падумаць аб наспеўшых дагаварах, кантрактах і стасунках як з дзелавымі партнёрамі, так і са спадарожнікамі жыцця. Гэты час спрыяльны для выпрацоўкі стратэгіі сваіх паводзінаў у вышэйазначаных сферах жыцця. Пастарайцеся скарыстаць усю моц свайго інтэлекту для прадбачання магчымасцяў будучых кампрамісаў і абходу вострых вуглоў.

БЛІЗНЯТЫ. Вельмі ўдалы час для павышэння свайго прафесійнага ўзроўню. На гэтым тыдні пастарайцеся падумаць над тым, якія новыя ўменні і веды патрабуюцца для далейшага вашага развіцця як прафесіянала. Калі вам штосьці не падабаецца, падумайце аб тым, што ў вашых сілах змяніць да лепшага, бо на рабоце ўсё ж такі праходзіць значная частка нашага жыцця.

РАК. На гэтым тыдні падумайце аб тым, у якіх галінах жыцця вы можаце ў поўную сілу рэалізаваць свой творчы патэнцыял. Зараз спрыяльны час для новых творчых задум, у якіх вы здолееце рэалізаваць свае таленты. Каханне і клопат аб дзецях таксама запатрабуюць ад вас пэўнай увагі і сіл. На гэтым тыдні вы адчуеце, з чаго канкрэтна можа складацца гэты клопат.

ЛЕЎ. Прыйшоў час, калі вам трэба ўдзяліць пэўную долю ўвагі, сіл і ўменняў клопатам аб сваім доме і сям'і. Калі вы будзеце дастаткова чулыя і ўважлівыя, здолееце вызначыць, на што прыйдзецца звярнуць асаблівую ўвагу і да чаго канкрэтна трэба прыкласці намаганні. Ад таго, наколькі правільна вы зразумееце, што ад вас патрабуецца, залежыць гармонія сямейных стасункаў і ўтульнасць у доме.

ДЗЕВА. На працягу гэтага тыдня пастарайцеся вызначыць, чаго не хапае вам для таго, каб адэкватна ўспрымаць словы і думкі іншых, а таксама — што перашкаджае вам самім выкладаць уласныя думкі дасціпна і зразумела. Не выключаны і розныя змяненні, якія датычаць вашых сродкаў сувязі і інфармацыі (тэлефоны, пэйджэры, камп'ютэры і г.д.).

ШАЛІ. Гэты тыдзень будзе спрыяльным для выпрацоўкі ідэй і планаў у фінансавай і маёмаснай сферах жыцця. Прыкладзіце максімум інтуіцыі і здольнасці прадбачання для таго, каб вашы замеры на практыцы не прынеслі выпадковых страт, а для гэтага правільна разлічыце свае магчымасці і сілы, а таксама прааналізуйце ўласныя запыты.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні вам неабходна будзе разабрацца з тым, што можа ў будучым стаць прычынай зніжэння жыццёвага тонуса, пагаршэння самаадчування альбо захворванняў. Пастарайцеся не выпусціць дробязей, якія могуць зрабіцца штуршком для вышэйазначаных непрыемнасцей. Вельмі карысна таксама пачаць усялякія заняткі па аздараўленні і рабоце над уласнай знешнасцю.

СТРАЛЕЦ. На працягу тыдня пастарайцеся адчуць, ад якіх сфер жыцця вам прыйдзецца адыйсці, па меншай меры — унутрана. Падумайце, як найбольш прадуктыўна для свайго ўнутранага свету правесці гэты перыяд зацішша. Галоўнае — не ўпадаць у смутак, а зразумець, што адзінота, асабліва ўнутраная, неабходная для далейшага паспяховага развіцця, як перадышка ў час працяглага падарожжа.

КАЗЯРОГ. Пастарайцеся прааналізаваць адносіны ў калектыве, з якім вы цесна звязаныя. Ацаніце сваё месца і мэту знаходжання ў ім. Калі надышоў час штосьці змяніць у стасунках з калектывам і сябрамі — не спяшайцеся з канкрэтнымі дзеяннямі, лепш прадумайце, што і як вы будзеце змяняць. Не забудзьце і аб сваім будучым, а дакладней — аб планах і праектах, што здзяйсняеце зараз і якімі будзеце займацца далей.

ВАДАЛЕЙ. На гэтым тыдні трэба добра прааналізаваць свае прэтэнзіі на сацыяльную значнасць, бо не заўсёды знешняя адзнака адлюстроўвае сапраўдную сутнасць чалавека. Будзьце сумленныя і адкрытыя перад самімі сабой. Калі вы знойдзеце свае прэтэнзіі апраўданымі — "поўны наперад", у вас ёсць някепскія магчымасці дабіцца больш высокага грамадскага становішча.

РЫБЫ. Для вас тыдзень паспрыяе пачынанням, датычным выпрацоўкі новых поглядаў на жыццё ды азнаямлення з новымі рэчамі ў галінах культуры, філасофіі і рэлігіі. Магчыма, таксама намецяцца пэўныя планы, звязаныя з падарожжам альбо камандзіроўкай. Канец тыдня пажадана прысвяціць якім-небудзь спакойным заняткам.

Аляксей КАРПІНСКІ.

Крик души

Помогите. Напишите. Полюбите...

Тоска и одиночество — очень тяжелое душевное состояние. А особенно — для мужчины, у которого нет физической возможности поддерживать отношения с женщиной. В таких случаях объявление в газете — чуть ли не последняя надежда на женскую любовь, ласку, нежность и понимание. Может быть, моя любимая газета поможет мне и моему другу, который так же одинок, как и я, найти спутницу жизни. Если возможно, напечатайте наши объявления. Заранее мы очень вам благодарны. Всего вам самого наилучшего в личной жизни. Пусть хранит вас Господь Бог.

Очень хочу познакомиться с женщиной до 37 лет, можно с ребенком, для серьезных отношений в будущем. О себе: 183 см, 75 кг, 34 года. Родился в год Дракона, Весы. Глаза карие, волосы темные, без вредных привычек, с хорошим чувством юмора. В данное время, правда, нахожусь в местах лишения свободы. Подробности при переписке.

Друг — Водолей, 185, 75кг, 33 года.

Егор ДАВЫДЕНКО,
Александр ПАРФЕНЧИК.
Адрес: 211030,
г.Орша Витебской области,
УЖ 15/12, 3-й отряд.

Пятница, 23 октября

БТ

06.30 Доброе утро, Беларусь!
07.00, 09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 00.05 Новости.
07.10 Доброе утро, Беларусь!
08.05 "Сегодня с вами...". Директор детского дома №2 Минска Валентина Зеневич.
08.45 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
09.15 ТВ — школе. История Беларуси. 10-й класс. Политика белорусизации в 20-е годы XX века.
09.45 Видеокурс английского языка. Передача 6-я.
10.10 Детский экран. "Остров вдохновения".
10.25 "Музыка без границ".
11.15 Сериал "Династия-2. Семья Колби".
12.00 Здоровье. Желчекаменная болезнь.
12.25 "А музыка звучит...". Поют Ренат Ибрагимов и Ион Суручану.
13.15 "Беларусь — моя песня". Гала-концерт первого фестиваля народного искусства. Ч. 3-я.
14.30 "Дерево жизни". Телеочерк о семье Червяковых (Минск—Полоцк).
15.10 Видеокурс немецкого языка. Передача 9-я.
15.30 "Портрет моего учителя". Руководитель театральной студии Республиканского Дворца детского творчества Н.Рачковская.
16.00 Родовод. Традиционная культура д.Псыщево Ивановского района Брестской области.
16.30 Телеигра "Риск-версия".
17.15 Уроки Н.Новожиловой.
17.45 Д/ф Литовского телевидения "Планета не только людей".
18.10 Сериал "Династия-2. Семья Колби".
19.15 "Сегодня с вами...". Театральный художник Дмитрий Мохов.
19.50 Континент. Обзор международных событий.
20.05 "Станция "Академия наук".
20.25 "Смеяться — не грех". Развлекательная программа "Банка комиксов".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
21.50 Белорусский хит-парад.
22.00 В.Гостюхин в х/ф "Охота на лис" ("Мосфильм").
23.35 Бездельник.
00.15 Авто-парк.
00.25 "Видеопроцесс". Развлекательная программа.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.05 Новости.
08.15 Сериал "Жестокий ангел".
09.20 Программа "Человек в маске".
10.00 "Чтобы помнили...". Ведущий — Л.Филатов.
10.40 Смак.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Сериал "Новые приключения Синдбада".
14.45 Фильм-сказка "Король Дроздобород".
16.00 Сериал "Жестокий ангел".
17.20 Джентльмен-шоу.
17.50 Играй, гармонь любимая!
18.25 Здоровье.
18.55 Поле чудес.
20.00 Время.
20.35 Спокойной ночи, малыши!
20.50 Детектив "Тайна Карибского залива".
23.25 Х/ф "Заложница".

РТР

06.00 Доброе утро, Россия!
08.15 Дежурная часть.
08.25 Доброе утро, Россия!
08.55 Товары — почтой
09.00 Сериал "Санта-Барбара".
09.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вести.
15.15 "Позвоните Кузе!".
15.30 Сериал "Первые поцелуи".
16.35 "Башня".
17.00 Боевик "Нулевой вариант".
18.35 1-я студия.
19.30 Подробности.
19.45 "Аншлаг" представляет.
20.40 Х/ф "Дьяволица" (США, 1989 г.).
22.20 "Театр + TV".
23.30 Дежурная часть.

КУЛЬТУРА

07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.25 Консилиум.
07.50 Евг. Габрилович. "Последний автограф".
08.10 Русская вилла в центре Рима.
08.55 Живое дерево ремесел.
09.00, 15.00, 17.00 Новости.
09.05 Х/ф "Хмурое утро".
10.40 "Российский курьер".
11.20 Видеопоэзия.
11.40 Спектакль "Мегрэ колеблется". 2-я с.
13.05 "Ваших душ золотые россыпи".
13.29 Азбука.
13.45 Д/ф "Насмотритесь, очи ясные".
14.35 "Без визы".
14.50 Поклонникам Терпсихоры.
15.05 Мультфильм "Белоснежка".
15.55 "Лукоморье".
16.20 "Беседы о русской культуре".
16.50 Паноптикум.
17.05 "2003".
17.10 "Вспоминая Инну Гофф".
17.50 Вечер с...
19.10 Чудо-сказка.
19.29 Азбука.
19.50 "Осенний монолог".
20.15 "Кино вчера и всегда".
20.45 После новостей...
21.05 Х/ф "Метрополис".

НТВ

05.00, 05.30, 06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
08.30 Дог-шоу "Я и моя собака".
09.15 Телеигра "Ключи от форта Байяр".
11.20 "Старый телевизор".
13.25 Сериал "Любовь и тайны Сансет Бич".
14.10 Сегоднячко.
15.15 "Русский век" с Андреем Карауловым.
15.45 Сериал "Зена — королева воинов".
16.30 Футбольный клуб.
17.30 Впрок.
17.40 Криминал.
18.45 Герой дня.
19.00 Детектив "Грачи" (1982 г.).
20.40 Профессия — репортер.
21.45 "Весь Жванецкий". 7-я с.
22.15 Х/ф "Широкое Саргассово море".

TV-6

06.00, 08.00, 10.00, 12.00, 14.00, 17.00, 22.50 ТСН-6.
06.10, 15.05 Мультсериал "Пуговка и Рыжик".
06.25, 07.45 Видеоклипы.
06.35, 16.45, 23.35 Дорожный патруль.
07.00, 16.10 ДИСК-канал.
07.35, 23.00 Те Кто.
08.15, 17.30 Сериал "Грейс в огне III".
08.40, 18.00 Сериал "Чехов и К".
09.30, 11.05, 13.45, 15.50 Телемагазин "Спасибо за покупку!".
10.10 Сериал "Lexx".
11.15 "Знак качества".
11.30 "Звезды о звездах". Катя Лель.
12.10 Х/ф "Дом там, где Харт".
14.10 Сериал "Эдера".
15.25 Сериал "Кунг-фу. Легенда продолжается".
19.00 "Новости дня".
19.35 Х/ф "Правосудие Стилла".
21.30 Ток-шоу "Акулы политпера".
22.00 Сериал "Голод".
23.20 Вечеринка из центра.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.
Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ПП "Мэджык". Адрас: г. Мінск, вул. В. Харужай, 13. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: суботні — 61050 экз., у другія дні — 55000 экз. Заказ №1253